***<u>Прымеркавана да Года кнігі ў Рэспубліцы Беларусь і 910-годдзя з дня нараджэння беларускай асветніцы Прападобнай Еўфрасінні Полацкай.</u>***



***Тэма: Вобраз Еўфрасінні Полацкай у сучасным беларускім мастацтве***

***Форма занятку: дзелавая гульня. Паседжанне рэдкалегіі па складанні даведніка " Вобраз Еўфрасінні Полацкай у сучасным беларускім мастацтве"***

***Мэта: паглыбленне ведаў пра жыццё і дзейнасць Еўфрасінні Полацкай, пашырэнне ведаў пра розныя галіны сучаснага беларускага мастацтва***

***Задачы: знаёмства з творамі сучаснага беларускага мастацтва, іх аўтарамі; развіццё даследчыцкай і маўленчай дзейнасці вучняў, умення выкарыстоўваць набытыя веды ў дзелавой сферы; выхаваннне грамадзянскай культуры, пачуцця павагі да нацыянальных каштоўнасцяў***

**Ход занятку:**

**Уступнае слова настаўніка:**



Сёлетні год, як вядома, абвешчаны годам кнігі. Думаю, што нас, жыхароў Віцебшчыны, гэта павінна закрануць у першую чаргу, таму што менавіта з кнігай звязана дзейнасць асоб, якія праславілі Віцебшчыну. Для нас кніга- гэта і Прападобная Еўфрасіння Полацкая, якая, перапісваючы кнігі, несла святло ведаў нашаму народу, 910 - годдзе якой мы адзначаем сёлета, гэта і Францыск Скарына, першадрукар і асветнік, і Спірыдон Собаль, які працаваў над букваром у некалькіх кроках ад нас, і Васіль Быкаў, якога ведаюць далёка за межамі Беларусі, і Рыгор Барадулін, народны паэт Беларусі.

Таму, каб быць дастойнымі славы нашых землякоў, прапаную вам ў год кнігі і ў сувязі з 910 - годдзем Еўфрасінні Полацкай таксама паспрабаваць скласці кнігу з назвай " Вобраз Еўфрасінні Полацкай у сучасным беларускім мастацтве" і ўявіць, што ў бліжэйшы час вы будзеце знаходзіцца не ў 20- й школе, а выдавецтве, дапусцім, Ў", на паседжанні рэдкалегіі, на якім вырашаецца пытанне аб стварэнні кнігі Вырашаць гэтае пытанне будуць члены рэдкалегіі, яны ж прадстаўнікі экспертнай групы па вывучэнні дадзенага пытання. Прапаную вам пазнаёміцца з парадкам паседжання:

I. Аб мэтазгоднаці стварэння кнігі (намеснік галоўнага рэдактара Пракопкіна Т. А.)

II. Прапановы мастака па афармленні дадзенай кнігі ( Руткоўская Дар'я, вучаніца 9 "Д" класа)

III. Прэзентацыя і абмеркаванне матэрыялаў, якія могуць быць змешчаны ў дадзенай кнізе :

1.Вобраз Еўфрасінні Полацкай у сучаснай публіцыстыцы
( прадстаўнік экспертнай групы Шарснёва Вольга, вучаніца 9 "Г" класа)

2. Вобраз Еўфрасінні Полацкай у сучаснай мастацкай літаратуры
(прадстаўнікі экспертнай групы Губенка Святлана, Шкрадава Даша, вучаніцы 9 "Б" класа)

3. Вобраз Еўфрасінні Полацкай у сучасным выяўленчым мастацтве
(прадстаўнік экспертнай групы Аўсюкевіч Яна, вучаніца 9 "Б" класа)

4.Вобраз Еўфрасінні Полацкай у скульптуры
(прадстаўнік экспертнай групы Туранская Карына, вучаніца 9 "Г" класа)

5. Вобраз Еўфрасінні Полацкай у іканапісе
(прадстаўнік экспертнай групы Папкова Таццяна, вучаніца 10 "Б" класа)

6. Вобраз Еўфрасінні Полацкай у ювелірным мастацтве
(прадстаўнік экспертнай групы Нікалаенка Вікторыя, вучаніца 10 "Б" класа)

7. Вобраз Еўфрасінні Полацкай у фільмаграфіі і музыцы
(прадстаўнік экспертнай групы па медыйным матэрыяле)

IV. Прэзентацыя складзенай кнігі(галоўны рэдактар)

**I. Намеснік галоўнага рэдактара:**

Я думаю, вы пагодзіцеся са мной, што цяжка назваць адукаваным чалавека, які не ведае мастацкай культуры. Скажам шчыра, такімі ведамі не можа пахваліцца наша пакаленне. Але ж імкнуцца да гэтага трэба. Вывучэнне жыцця і дзейнасці Еўфрасінні Полацкай - цудоўная магчымасць пазнаёміцца з сучасным беларускім мастацтвам, таму што вобраз нябеснай заступніцы Беларусі прадстаўлены сёння і ў літаратуры, і ў выяўленчым мастацтве, у музыцы, фільмаграфіі, у графіцы, скульптуры, ювелірным мастацтве. Раней такія пытанні асвятляліся на ўроках па сусветнай мастацкай культуры, а цяпер прыйшоў час пра гэта паклапаціцца нам, прадстаўнікам сродкаў масавай інфармацыі

**Галоўны рэдактар:**

Я так зразумела, што кніга патрэбна, каб нашы вучні мелі ўяўленне пра беларускае мастацтва і яго прадстаўнікоў, і звяртацца да яе яны змогуць, калі будуць вывучаць жыццё і дзейнасць святой як па дадатковы матэрыял? Згодна з Вамі, лічу, што сапраўды такая кніжка вучням нашай школы патрэбна. Хацелася б даведацца ў мастака- афарміцеля, як ён сабе яе ўяўляе. Слова мастаку.

**II. Мастак:**

Кніга будзе ўяўляць сабой друкаваны варыянт выступаў нашых экспертаў, аздоблены ілюстрацыямі, над гэтым матэрыялам я папрацавала загадзя.

Для таго каб зацікавіць вучняў зместам нашай кнігі, прапаную у пачатку кнігі змясціць наступны тэст :

*Назавіце вядомых вам дзеячаў беларускага мастацтва:*

*1. Мікола Купава*

*2. Арлен Кашкурэвіч*

*3. Аляксей Марачкін*

*4. Уладзімір Арлоў*

*5. Мікола Кузьміч*

*6. Ігар Голубеў*

*7. Сяргей Тарасаў*

*8. Нінэль Шчасная*

*9. Арлен Кашкурэвіч*

*10. Сяргей Лагуновіч-Чарапко*

*11. Анатоль Арцімовіч*

*12. Святлана Заскевіч*

*13. Вольга Іпатава*

*14. Сяргей Тарасаў*

*15. Людміла Рублеўская*



А для таго каб яны зразумелі, у якой ступені кніга была для іх карыснай, размясціць той жа тэст на апошняй старонцы кнігі.

Пры выбары эскіза вокладкі я разгубілася і прашу дапамагчы мне з выбарам нашых гасцей.

**Галасаванне.**

**III. Галоўны рэдактар:** З прынцыпам складання кнігі мы пазнаёміліся, давайце пяройдзем да абмеркавання яе зместу. Слова эксперту па публіцыстычнай літаратуры.



**1.Аўтар (публіцыстычная літаратура), слайды 4,5**
Я лічу, што звесткі пра Еўфрасінню Полацкую, атрыманыя з крыніц публіцыстычнага жанру , найбольш важныя і абавязкова павінны ўвайсці ў змест нашай кнігі, бо ў адрозненні ад мастацкай літаратуры тут аўтар не можа дазволіць сабе пафантазіраваць, дамысліць, ён кіруецца толькі дакладнай інфармацыяй, але даносіць яе ў займальнай форме, што вельмі важна для нашага ўзросту.

Кніга Уладзіміра Арлова “Еўфрасіння Полацкая” прысвечана апісанню жыцця святой. У гэтай кніжцы у займальнай папулярнай форме распавядаецца пра полацкую князёўну Прадславу, якая жыла ў XII стагоддзі, у юныя гады пастрыглася у манастыр, стала выдатнаю асветніцай: адчыняла школы і скрыпторыі, была збіральніцай і апякункаю талентаў, брала чынны ўдзел у грамадска-палітычным і культурным жыцці Полацкага княства, а пасля была прылічана да святых і прызнаная нябеснаю апякункаю беларускай зямлі. Апрача папулярнага нарыса жыцця і духоўных подзвігаў святой, у кнігу ўключана яе «Жыціе», звернутыя да Еўфрасінні Полацкай малітвы, а таксама аповяд пра загадкавае знікненне і пошукі нацыянальнай рэліквіі — напрастольнага крыжа, створанага на заказ падзвіжніцы у 1161 годзе.

Канечне, Вы можаце сказаць, што гэта вам і так вядома з урокаў гісторыі і беларускай літаратуры, але ў гэтай кнізе ёсць тое, пра што “Жыціе..” маўчыць.

А маўчыць яно пра тое, як дыпламатычны талент і аўтарытэт полацкай князеўны спыняў княжацкія міжусобіцы; пра тое, што ў юнацтве князеўна была сведкай паходу кіеўскага князя Мсціслава на полацкую зямлю, і калі высылалі Рагвалодавічаў, яна заставалася адзінаю прадстаўніцаю полацкай дынастыі на радзіме, і менавіта са згоды князёўны палачане выгналі Святаполка Мсціславіча і зрабілі сваім князем Васільку Святаславіча. Такім чынам, Еўфрасіння мела вялікую вагу ў вырашэнні палітычных пытанняў. Дарэчы, толькі калі на Полацкай зямлі ўсталяваўся адносны спакой, Еўфрасіння вырашыла зрабіць паломніцтва ў Іерусалім.

Напрыканцы свайго выступу хачу сказаць, што хоць дадзены твор і адносіцца да публіцыстычнага жанру, аднак чытаць яго было легка і цікава: я не проста атрымала інфармацыю, але і адчула эпоху, у якой жыла наша асветніца, разам з аўтарам я вандравала па вуліцах старажытнага Полацка, разважала аб тым, на якіх кнігах магла вырасці асветніца, што магло яе падштурхнуць да такога выбару. Гэты твор значна папоўніў мае веды пра дзейнасць Еўфрасінні Полацкай і даў магчымасць паглядзець на яе не толькі як на гістарычную асобу, але і як на адмысловую жанчыну, чалавека.

**Член рэдкалегіі:** На мой погляд, у дадзеным раздзеле не хапае інфармацыі пра іншых аўтараў, якія пісалі пра Еўфрасінню Полацкую.

**Аўтар:** Вы прапануеце расказаць змест усіх публіцыстычных твораў пра Еўфрасінню Полацкую?

**Член рэдкалегіі:** Думаю, пра змест другіх кніг не варта распавядаць, а вось пра аўтараў сказаць трэба абавязкова.

**Галоўны рэдактар :** Стаўлю пытанне на галасаванне.

Вырашана: у дадзены матэрыял унесці дапаўненне і ўключыць у кнігу.

**Намеснік галоўнага рэдактара:** Я прапаную таксама расказаць ў нашай кнізе пра тое, як уяўляюць сабе вобраз Еўфрасінні Полацкай прадстаўнікі мастацкай беларускай літаратуры. Давайце паслухаем

**2.Аўтар (Сяргей Тарасаў. “Фрэскі”), слайды 6-8**



Самай старажытнай выявай Еўфрасінні Полацкай доўгі час лічылася фрэска на паўночна- заходнім стоўпе Спаскай царквы, раскрытая ў 1950

На ёй мы бачым выяву жанчыны ў шчыльна павязаным манаскім плаце, з німбам. Яркую індывідуальнасць аблічча святой падкрэсліваюць выразныя рысы твару: высока паднятыя паўкруглыя бровы, шырока расстаўленыя вочы.

Здаецца, што яшчэ мы можам сказаць пра гэты твор мастацтва?

Гісторык і пісьменнік Сяргей Тарасаў прысвяціў гісторыі стварэння гэтай фрэскі цэлае апавяданне, вельмі цікавае і прыгожае.

Ен прымусіў нас акунуцца ў гістарычную атмасферу Полацка 12-га стагоддзя, калі яго вуліцы яшчэ былі вымашчаны бярвеннем, прымусіў пaглядзець на Сяльцо, калі ішло будаўніцтва манастыра, які і сення знаходзіцца ў Полацку.

Таленавітымі людзьмі заўседы была багата Беларусь, адным з іх і з’яўляецца галоўны герояў апавядання мастак Лукаш, якому даручана упрыгожыць Спасаўскі манастыр фрэскамі з выявамі святых . Але на адной з такіх фрэсак Еўфрасіння спазнае сябе .

- Я бачыла тваю работу. Майстра…Ці не занадта дазваляеш сабе?

Лукаш апусціў галаву.

- Я усяго толькі грэшная манахіня,- працягвала Еўфрасіння,- смяротны чалавек, які нарадзіўся і памрэ. Ты ж павінен пісаць лікі святых - тых, хто быў і вечна будзе. Ты мяне разумееш?
- - Разумею.
- Тады перапішы лікі нанава…
- Не…
- Чаму?
- А ты не разумееш, Прадслава?
- Лукаш,- у голасе ігуменні пачулася цеплыня.- Лукаш, ты ж ведаеш: няма больш князёўны і няма больш Прадславы. Гэта не вернецца, як не вернуцца нашы гульні на бацькавым дворышчы…Забудзь! Так трэба. Ты чуеш мяне?
- Чую.

- Перапішы лікі…
- Не буду.
- Тады…я змагу загадаць табе, але я прашу: не рабі так болей.
- Добра

І яны разышліся.

Як бычыце, аўтар дазволіў сабе дамысліць, што мастак быў закаханы ў ігуменню яшчэ з тых часоў, калі яна была Прадславай. Хто ведае, можа, сапраўды дзякуючы каханню з’явілася гэта фрэска, дзякуючы якой мы сення , праз дзевяць стагоддзяў, можам уявіць сабе, як выглядала ў жыцці беларуская святая .

“Белы, з лёгкім румянцам авальны твар,апраўлены ў манаскі клабук, трошкі завостраны падбародак, шырока пасаджаныя блакітныя вочы. Вочы Ефрасінні-Прадславы…Яны пранізваюць, з глыбокім сумам глядзяць, быццам пра нешта пытаюць!”

**Галоўны рэдактар:** Значыць, Сяргей Тарасаў мяркуе, што выява Еўфрасінні Полацкай, якая захавалася на фрэсцы,- вынік таго, што мастак Лукаш быў закаханы ў Еўфрасінню.Прыгожая гісторыя.

**Член рэдкалегіі :** Мне здаецца, што дадзены эксперт злоўжывае цытатамі

**Член рэдкалегіі :** А па- мойму, не:  цытаты толькі падаграваюць інтарэс да гэтай кнігі.

**Галоўны рэдактар :** Стаўлю пытанне на галасаванне.

Вырашана: дадзены матэрыял у кнігу ўключыць разам з цытатамі. Гэта ўсё па мастацкай літаратуры?

**Намеснік галоўнага рэдактара:** Не. Ёсць яшчэ адна работа.

**<u>3.Аўтар : (Вольга Іпатава. “Прадслава”), слайды 9-12</u>**



Гістарычная тэматыка характэрна для творчасці такой сучаснай беларускай пісьменніцы, як  В. Іпатава.  Тэматыка яе твораў разнастайная, але асноўныя тэмы – перыяд жыцця славян у дахрысціянскі перыяд, станаўленне рэлігіі. Вольга Іпатава — прызнаны майстар гістарычнай прозы. Аўтар цыклу апавяданняў "Гул далёкіх стагоддзяў" , аповесцяў "Агонь у жылах крэменю", "Чорная княгіня", "За морам Хвалынскім" (усе 1989), трылогіі "Залатая жрыца Ашвінаў", "Вяшчун Гедзіміна", "Альгердава дзіда" (2002).
Але мяне здзівіла біяграфія Вольгі Іпатавай.

Хоць нарадзілася янаў пераможным 1945 годзе, аднак дзяцінства яе пазначана асабістай трагедыяй — у чатырохгадовым узросце яна страціла маці.  Жыццё ў бабулі, сям'і бацькі і мачыхі, у дзіцячым доме — гэта той асяродак, маральная атмасфера, у якіх

праходзіла яе дзяцінства і юнацтва. Яна рана адчула сваю самастойнасць, навучылася разумець і пераадольваць цяжкасці, супярэчнасці паўсядзённага побыту і ўзаемаадносіны людзей, сама вымушана была прабіваць дарогу.

Ведаеце, мне здаецца, што менавіта гэтая адметнасць лесу пісьменніцы наклала адмысловы адбітак на яе асабісты характар і ў сваю чаргу на адметнасць таго вобразу, які яна стварыла ў сваей аповесці "Прадслава". Беларуская святая паказана даволі строгім і суровым да жыцця і да людзей чалавекам, яна часам здзіўляе сваей не па-жаночы моцнай воляй, халодным практычным розумам, мне здаецца, што пісьменніца і сама валодае такімі рысамі характару.

Пісьменніца ў сваёй аповесці абапіраецца на жыццёвыя вехі святой, ведамыя з хронік, запісаў, дакументальных сведчанняў, але шмат у творы і аўтарскай інтэрпрэтацыі, што робіць аповесць цікавай і займальнай.

Калі слухаеш  аповесць, здзіўляе шырыня мастацкага вымыслу пісьменніцы, яе жаночы погляд на тое, чаму ж насамрэч Прадслава ўцякла ў манастыр .

Паводле твору Вольгі Іпатавай княгіня кахала таго, каго кахаць было не дазволена… Яна не пабаялася ні бацькоў, ні размоў вакол сваей асобы і  сваім адыходам у манастыр  захавала жыцце свайму каханаму, якога за адносіны з ёй па тым часе павінны былі проста забіць, і такія прыклады яна назірала на ўласныя вочы. І згэтым каханнем яна літаральна змагалася ўсе свае жыцце, нават калі была ўжо ягуменняй.

На мой погляд, гэтая аповесць – спроба паказаць беларускую святую звычайным чалавекам.  Яна была маладой, яна кахала. Не чужымі ёй былі пачуцці і перажыванні, якія адчувае кожная маладая дзяўчына і вякі таму, і сёння. Прадыслава ў гэтай аповесці паказана маладой  закаханай дзяўчынай, якая мела адвагу, сілу волі і ўпартасць настаяць на сваім – пайсці ў манастыр насуперак бацькоўскай волі, каб не здрадзіць свайму каханню і  ісці па жыцці з упэўненасцю  ў слушнасці свайго выбару.

У мяне не атрымалая знайсці аповесць у друкаваным выглядзе, але мне было цікава слухаць аўдыяварыянт гэтага твора ў выкананні Андрэя Каляды, і я раю пазнаёміцца з аповесцю  і вам.

**Член рэдкалегіі:** Шаноўны аўтар, мне здаецца, у сваім артыкуле вы захапіліся выкладам біяграфіі пісьменніцы, выхад нашай  кнігі не ставіць такіх задач , у такім выпадку давайце раскажам біяграфію Уладзіміра Арлова, Сяргея Тарасава…

**Аўтар:** Гэта біяграфія не дзеля біяграфіі, справа ў тым, што я спачатку пазнаёмілася з аповесцю, а потым мне захацелася пацікавіцца асобай Вольгі Іпатавай.  Я зразумела, што пісьменніца надзяліла гераіню рысамі характару, уласцівымі для яе самой: рашучасцю, непарушнай цвёрдасцю, за якімі хаваецца мудрасць і любоў да людзей. Таму не магла не выказаць гэтае меркаванне ў сваёй рабоце.

**Галоўны рэдактар:** Хто за тое, каб падтрымаць аўтара, прашу падняць рукі.

Вырашана: дадзены матэрыял у кнігу ўключыць.

Але чаму мы вядзём гаворку толькі пра літаратуру?

**Намеснік галоўнага рэдактара:** Не толькі, зараз будзе прадстаўлены матэрыял па выяўленчым мастацтве



**4.Аўтар (выяўленчае мастацтва), слайды 13-30**

Шмат якія беларускія мастакі звярнуліся да вобразу Еўфрасінні Полацкай у сваёй творчасці.

Нінэль Іванаўна Шчасная, дарэчы, ураджэнка Полацка, - беларускі жывапісец і графік. Удзельніца больш за 50 персанальных выстаў у Беларусі і за мяжой. Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР.

Як сцвярджае сама мастачка, Еўфрасіння полацкая малявалася ёй неаднойчы ў самых розных творах, але заўжды вельмі важна было знайсці ў яе вобразе адухоўленасць, глыбіню без пазіравання. Калі Нінэль Шчасную назвалі Ганаровым грамадзянінам Полацка, яна ў адказ падарыла гораду карціну “Наша жамчужына”: Еўфрасіння ўзносіцца над царквой і трымае ў руках жамчужыну. На гэтай карціне мы бачым, што беларуская святая нібы ахоўвае палачан сваім празрыстым адзеннем, гэта дасягаецца за кошт таго, што да жывапіснага сюжэта мастачка дадала драпіроўкі з празрыстага чысцютка-белага шкловалакна, якое выпрабляецца ў Наваполацку і вось ужо дваццаць гадоў з’яўляецца адным з яе любімых матэрыялаў з-за яго незвычайных дэкаратыўных магчымасцей. Адзенне галоўнай гераіні карціны аб’ёмнае, яно ,як своеасаблівая заслона, часткова прыадкрывае нам зямлю з выявай пабудаванай Еўфрасінняй царквы.Сёння гэты твор захоўваецца ў фондах Полацкай карціннай галерэі.

Гэтай жа мастачцы належыць трыпціх “Еўфрасіння Полацкая і Спаса- Еўрасіннеўская царква”, на якой, калі ўважліва прыгледзецца, можна уявіць, як Еўфрасіння размаўляе з дойлідам Іаанам, а можа, дорыць яму натхненне, недарэмна ж царква была пабудавана ўсяго за 30 тыдняў.

Муж і жонка Валянцін і Ляіля Варэцы паходзяць з Украіны. У Беларусь прыехалі толькі ў 1985 годзе, але так захапіліся нашай гісторыяй і культурай, што стварылі серыю карцін пад агульнай назваю “Гістарычныя асобы Беларусі”. Паводле літаграфіяў былі складзеныя два альбомы рэпрадукцыяў. У кожным альбоме па 20 асобаў, якія аказалі ўплыў на палітычнае ці культурнае развіццё Беларусі. Адна з такіх работ- літаграфія "Евфросиния Полоцкая" , на якой мы бачым святую на фоне карты старажытнага Полацка, побач- нязменныя сімвалы: крыж і царква.

Шмат якія творы мастакоў ўвайшлі ў падручнікі для школ. Зараз сужонцы жывуць у Аўстраліі.

Аляксей Антонавіч Марачкін - беларускі жывапісец, педагог.

Працы А. Марачкіна захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, у музеях і прыватных галерэях Беларусі, Польшчы, Германіі, ЗША.

Да 70-годдзя вядомага беларускага мастака Аляксея Марачкіна ў Мінску адкрылася выстава твораў з серыі “Постаці”, над якой творца працуе ўжо два гады. Былі прадстаўлены 26 выяў знакамітых гістарычных асоб нашай краіны ад Еўфрасінні Полацкай да Эміліі Плятэр.

На карціне “Еўфрасіння Полацкая” мы бачым гераіню у не зусім традыцыйным успрыманні, тут яна паказана не манахіняй, а князёўнай, але калі прыгледзецца, на карціне можна адшукаць шмат сімвалаў, якія глыбока раскрываюць вобраз святой.



Арлен Міхайлавіч Кашкурэвіч працуе ў жанры станковай графікі. З’яўляецца ўладальнікам дзясяткаў міжнародных і нацыянальных прэмій за кніжнае афармленне. Ён вядомы таксама і як аўтар графічных ілюстрацый да “Жыція Еўфрасінні Полацкай”, якія вы зараз бачыце.

Мікола Купава - сучасны беларускі мастак. Ён нарадзіўся ў нашым горадзе, таму да яго творчасці мы ставімся з асаблівай цікавасцю. Нам добра вядомы ілюстрацыі Міколы Купавы да кнігі казак Уладзіміра Караткевіча “Лебядзіны скіт”. Мастак працуе ў галіне кніжнай і станковай графікі, акварэлі, жывапісу. Цікава, наколькі па-рознаму ён бачыць вобраз святой: на адной з ілюстрацыйй да кнігі Сяргея Тарасава “Фрэскі” гэта Еўфрасіння - жачына, якая на нейкі час зняла манаскі клабук і, хоць ужо і стомленая, але працягвае займацца перапісваннем кніг, і тут жа мы бачым работу таго ж аўтара, якая ўяўляе сабой ікону з выявай святой.

Як вы бачыце, вобраз Еўфрасінні Полацкай вельмі паўплываў на творчасць ў беларускіх мастакоў.

**Член рэдкалегіі:** Як на мой погляд, то калі мы дэманструем ілюстрацыі да жыція, то побач з імі варта было б размясціць і цытаты з гэтага твора.

**Галоўны рэдактар:** Згодна, хто за тое, каб уключыць матэрыял у кнігу, дапоўніўшы яго цытатамі з жыція?

Вырашана: дадзены матэрыял у кнігу ўключыць.

А па скульптуры ў нас ёсць які - небудзь матэрыял?

**Намеснік галоўнага рэдактара:** Ёсць .



**5.Аўтар: (скульптура), слайды 31-37**

Я вам хачу паведаміць пра тое, як адлюстраваны вобраз Еўфрасінні Полацкай ў такім відзе сучаснага мастацтва, як скульптура.

Першы помнік беларускай святой быў усталяваны ў 1999 годзе ў Мінску у дворыку БДУ. Як вы можаце бачыць, гэты помнік адліты з бронзы і ўсталяваны на гранітным п’едэстале . Святая прадстаўлена з наперсным

крыжам, пяром і кнігай, хутчэй за ўсё, Бібліяй, у руках. Побач стаіць невялікі столік з паперай і чарніліцай.

Аўтарам помніка з'яўляецца вядомы беларускі скульптар- манументаліст Ігар Голубеў, наш зямляк, бо нарадзіўся ў Віцебску. Ен , дарэчы, таксама з'яўляецца аўтарам помніка Уладзіміру Караткевічу, што знаходзіцца ў дзіцячым парку нашага горада.

Другі помнік Еўфрасінні Полацкай быў усталяваны  на яе радзіме ў Полацку ў 2000 годзе.

 Помнік вышынеей у тры метры 20 сант. усталяваны ў цэнтры горада, ен стаіць на скрыжаванні вуліц, адна з якіх вядзе да Спаса- Ефрасіннеўскага манастыра, дзе захоўваюцца мошчы святой. На гранітным пастаменце мы бачым святую  ў  манаскім адзенні, у правай руцэ  яна трымае крыж, у левай апушчанай – ружанец.

Гэты праект  таксама выканаў мінскі скульптар, член Саюза мастакоў Уладзімір Голубеў.

Аўтарам трэцяга помніка Еўфрасінні Полацкай з'яўляецца беларускі скульптар-манументаліст, прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў  Анатоль Яфімавіч Арцімовіч, на гэтым помніку Еўфрасіння трымае крыж, на плячах два галубы, напэўна, таму, што сама  была голубам міру для палачан,бо, як сведчыць гісторыя, заклікала спыняць братазабойчыя войны і княжацкія сваркі.

**Член рэдкалегіі:** Мне здаецца, што і ў матэрыяле па выяўленчым мастацтве, і па скульптуры не хапае больш поўнага  апісання твораў мастацтва

**Аўтар:** Шаноўны калега, перада намі  стаяла задача данесці сваім равеснікам, якія мастакі ў сваёй творчасці адлюстравалі вобраз Еўфрасінні Полацкай. Падрабязна і кампетэнтна пра карціну ці скульптуру можа расказаць толькі сам мастак, скульптар або крытык мастацказнаўства, гэта вельмі адказная работа, мы  дазволілі  сабе выразіць толькі сваё ўражанне, на што маем  права як аўтары.

**Галоўны рэдактар:** Хто за тое, каб падтрымаць аўтара, прашу падняць рукі.

Вырашана: дадзены матэрыял у кнігу ўключыць.

**Намеснік галоўнага рэдактара:** Але гэта не ўсё, мы не можам не расказаць пра вялікую колькасць ікон з выявай Еўфрасінні Полацкай

**<u>6.Аўтар: (іканапіс), слайды 38-44</u>**



Іканапіс- гэта асобы від мастацтва, якое патрабуе не толькі вызначных навыкаў, але і глыбокага разумення таго, над чым працуе іканапісец і што стварае. Тут важна  ўлавіць усе дэталі: погляд, нахіл,  кампазыцыю, якія сімвалічна могуць распавесці пра жыццё святога, бо менавіта дзякуючы абразу мы маем жывое ўяўленне пра святую гістрыю. Еўфрасіня Полацкая - беларуская святая, заступніца Беларусі перад Богам. З яе аблічам было створана шмат ікон, пачынаючы з дванаццатага

стагоддзя. Сёння такія іконы ствараюцца ў сваёй большасці паслушніцамі Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра. Калі я шукала матэрыял па тэме, мяне здзівіла, што праца ў іканапіснай манастыра пачынаецца пасля сняданку і працягваецца да вячэрняга набажэнства. Перад пачаткам працы сёстры чытаюць малітвы іх каля шасці ,каб святые дапамаглі ім у гэтай цяжкай справе.

Раглядаючы абразы, я звяртала ўвагу перш за ўсё на погляд святой – ён заўсёды суре’зны, засяроджаны, накіраваны наперад, удалячынь, і мы ведаем, што яна сапраўды глядзела ў будучае. І таму сёння, праз дзевяць стагоддзяў, мы гаворым пра яе, просім у яе дапамогі, бачым і Спаса-Ефрасінеускім манастыр, і адноўлены крыж. На ўсіх іконах святая трымае свой крыж-адзнаку хрысціянскай веры, але часам мы бачым у яе руках кветку. Гэта кветка, як правіла, пагадвае лілею. З аднаго боку яна можа быць сімвалам цнатлівасці святой, з другога, калі гэта, да прыкладу, папараць-кветка, яна можа быць сімвалам адыходу ад паганства. Паколькі, як я сказала, іканапіс- гэта асобы від мастацтва, часцей за ўсё аўтар абразоў застаецца невядомым. Аднак я магу сказать, што адна з самых апошніх ікон з выявай святой напісана Міколам Купавам, вядомым беларускім мастаком, які нарадзіўся ў Оршы.

І ў заключэнні дадам, што такім вобразам з выявай Ефрасінні Полацкай моляцца не толькі ў Беларусі. Гэта таксама адна з апошніх ікон, яна была створана беларускім іканапісцам Аленай Ткачовай і дастаўлена ў Бельгію беларускімі паломнікамі.

**Член рэдкалегіі:**Вы сказалі, што іконы з выявай Еўфрасінні Полацкай ствараліся,пачынаючы з трынаццатага стагоддзя, іх вялікая колькасць. Па якім прынцыпе мы будзем выбіраць ілюстрацыі да нашай кнігі?

**Аўтар:** Я думаю, што гэта пытанне не да мяне, а да мастака

**Мастак**: Паколькі пра падборы ілюстрацый мы ў асноўным карысталіся інтэрнэт- рэсурсамі, думаю трэба выбраць тыя, якія маюць лепшае электроннае разрашэнне. Менавіта іх я прапанаваў выкарыстаць аўтару.

**Галоўны рэдактар:** Хто за тое, каб матэрыял у такім выглядзе быў уключаны ў кнігу, прашу падняць рукі.

Вырашана: дадзены матэрыял у кнігу ўключыць.

**Намеснік галоўнага рэдактара:**

Існуе яшчэ і ювелірнае мастацтва, у ім таксама вобраз Еўфрасінні Полацкай прадстаўлены шырока. Запрашаем эксперта ў гэтай галіне.



**Аўтар (ювелірнае мастацтва), слайды 45-51**

Не абышло вобраз Еўфрасінні Полацкай і ювелірнае мастацтва. Яно прадстаўлена памятнымі манетамі Нацыянальнага банка Беларусі.

Прыкладам можа служыць срэбная манета з залатым рэльефам выявы ўваходу ў келлю і Крыжа Еўфрасінні Полацкай, выпуск якой быў прымеркаваны да 900-годдзя беларускай святой . Манета была ўведзена ў абарачэнне ў 2001 годзе. Яе мастаком з'яўляецца *Святлана Заскевіч*, выпускніца беларускай акадэміі мастацтваў кафедры графічнага дызайну.

Гэтая ж мастачка з'яўляецца і аўтарам манеты *"Крыж Ефрасінні Полацкай"* , якая стала пераможцам ў намінацыі "*Самая натхняльная манета"* на міжнародным конкурсе "Манета года 2009", арганізаваным амерыканскім выдавецтвам "Краузе Паблікейшнс".

Таксама існуе і залатая памятная манета Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, выпушчаная ў 2008 годзе, якая называецца *«Преподобная Евфросиния Полоцкая»*.

У Спаса-Прэабражэнскай царкве доўгі час захоўваўся Крыж Еўфрасінні Полацкай,зроблены Лазарам Богшам. Крыж з'яўляўся адной з галоўных святынь Полацка. У 1941годзе шэдэўр ювелірнага мастацтва захоўваўся ў Магілёўскім краязнаўчым музеі, адкуль знік пры нявысветленых абставінах. У1992 годзе было прынята рашэнне аб аднаўленні Крыжа Еўфрасінні Полацкай.Гэту справу даручылі Мікалаю Кузьмічу, таленавітаму беларускаму ювеліру з Брэста. Ён не раз паказваў свае выставачныя працы ў Расіі і Германіі, дзе яны заўсёды суправаждаліся захопленымі водгукамі прафесіяналаў і шчырай цікавасцю публікі.



Але для стварэння копіі Крыжа Еўфрасінні Полацкай неабходна было валодаць унікальнай тэхнікай старажытнавізантыйскай перагародчатай эмалі , якая была на той час амаль невядомай. Мікалай Кузьміч быў у разгубленасці, ён ня ведаў, з чаго пачынаць.Навуковых даследванняў ў яго на той час не было ,а ўяўленні аб Крыжы Прападобнай Еўфрасінні Полацкай ён меў зусім прыблізныя. І мастак адправіўся вандраваць па Святой Зямлі,паўтараючы подзвіг Еўфрасінні Полацкай. Там ён шмат хадзіў па розных музеях,размаўляў з навукоўцамі і гісторыкамі, там жа былі закуплены каштоўныя камянні для вырабу Крыжа.

Калі ён вярнуўся дадому,ён зноў прыступіў да працы.Але карыстацца сучаснымі тэхналогіямі ён не меў права,а старадаўніх не ведаў.

Але выйсце знайшлося само па сабе . Відэаматэрыял

Як бачыце, зусім выпадкова ў лютым 1996 года ў сне Мікола Кузьміч знайшоў гэты страчаны спосаб, і ў 1997 годзе праца над стварэннем Крыжа , якая працягвалася пяць год, была скончана. Усеправаслаўная святыня была асвечана і ўстаноўлена ў Полацкім Спаса- Еўфрасіннеўскім манастыры.

**Член рэдкалегіі:** Матэрыял, канечне, вельмі цікавы, але чаму Вы нам яго прадстаўляеце відэаматэрыялам, як гэта можна змясціць у нашай кнізе?

**Аўтар:** Думаю, гэты матэрыял можна змясціць у выглядзе электроннага дадатку.

**Галоўны рэдактар:** У такім выпадку што яшчэ можна змясціць у такім дадатку?

**Намеснік галоўнага рэдактара:** У нас ёсць эксперт па медыйным матэрыяле, давайце яго запросім.

**7.Эксперт па медыйным матэрыяле:** Такі дадатак могуць скласці фільмы "Еўфрасіння Полацкая", "Крыж Еўфрасінні Полацкай", электронны варыянт выступаў нашых экспертаў, відэакліп з песняй Анжалікі Агурбаш .

**Член рэдкалегіі:** Я думаю, туды ж можна ўключыць аўдыяматэрыял зборніка старажытнай беларускай музыкі "Полацкі Сшытак", акая аздабляе выступы нашых экспертаў, бо гэтая музыка вельмі добра передае атмасферу часу Еўфрасінні Полацкай.

**Галоўны рэдактар:** Хто за тое, каб матэрыял у такім выглядзе быў уключаны ў кнігу, прашу падняць рукі.

Прымаю рашэнне: кнігу ў прапанаваным экспертамі і членамі рэдкалегіі выглядзе прыняць!




**IV.** Галоўны рэдактар прэзентуе складзены даведнік

**Намеснік галоўнага рэдактара:**

**У кабінеце беларускай мовы, куды я прыходжу штодня, захоўваецца вельмі каштоўная рэч- зборнік паэзіі народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна "Ксты", намінаваны на Нобелеўскую прэмію, падараваны аўтарам вучням нашай школы. А калісьці малады паэт пачынаў са сціплага зборнічка вершаў "Маладзік над стэпам". Хто ведае, можа, наша першая сумесная кніжка , складзеная ў год кнігі, стане для кагосьці першым крокам да стварэння кнігі такога ўзроўню.**